УДК 94(477.75)|1939/1945|

***Грыбава С. У.***

# ДЗЕЙНАСЦЬ ЭДЫГЕЯ ШЫНКЕВІЧА ЯК ПРАДСТАЎНІКА НАЦЫЯНАЛІСТЫЧНЫХ ТАТАРСКІХ КОЛАЎ КРЫМА НАПЯРЭДАДНІ І Ў ГАДЫ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

*Данная статья посвящена деятельности лидера националистических кругов Крыма Эдыгея Шинкевича накануне и в годы Второй мировой войны. Автор отмечает влияние польской политики Прометеизма в межвоенный период на формирование националистических взглядов в среде польско-литовких татар. В статье автор прослеживает связь муфтията в Вильно с представителями Крыма, нацеленными на использование оккупационного режима в годы Второй мировой войны в своих националистических устремлениях, а именно создания татарского национального государства в Крыму. В статье подробно анализируются действия Эдыгея Шинкевича по реализации данной цели, отмечается, что несмотря на определённые дого-воренности, достигнутые с немецкими властями в данном направлении, их заинтересованность в осуществлении конечной цели Э. Шинкевича и его соратников отсутствовала.*

Татарска-мусульманскае насельніцтва СССР, безумоўна, прыўнесла ўклад у агульную перамогу над ворагам падчас Другой сусветнай вайны, прымаючы ўдзел у розных формах антыфашысцкага супраціўлення. Аднак таталітарны сталінскі рэжым 1930-х гг. – перагібы ў рэлігійнай і нацыянальнай палітыцы, індустрыялізацыя і насаджэнне калгасаў, чысткі ў арміі і дзяржапараце – выклікалі негатыўны настрой у пэўнай часткі насельніцтва. Дарэчы, антысталінізм, а таксама лозунгі стварэння сваёй нацыянальнай дзяржавы былі асноўнымі матывамі ў шмат якіх прадстаўнікоў усходніх цюркска-мусульманскіх народаў СССР, у тым ліку і ў крымскіх татар, якія ў той ці іншай ступені супрацоўнічалі з акупантамі. Трэба, безумоўна, браць у разлік і прапагандысцкія захады германскіх улад, што таксама падштурхоўвала насельніцтва акупаваных рэгіёнаў да супрацоўніцтва з імі.

Колькасць мусульман, грамадзян СССР, ва ўзброеных сілах Германіі ў 1941–1945 гг. складала прыкладна 290–305 тысяч чалавек, у тым ліку «туркестанцы», паўночнакаўказцы, азербайджанцы, паволжскія і крымскія татары [1, с. 253]. Дзейнічалі асобныя мусульманскія легіёны. У гісторыі няма звестак аб стварэнні вайсковага фарміравання ў складзе баявых частак германскіх узброеных сіл менавіта з польска-беларуска-літоўскіх татараў, продкі якіх былі паселены на гэтых землях яшчэ ў XIV ст. князем ВКЛ Вітаўтам. Аднак усё ж захаваліся прыклады ўдзелу прадстаўнікоў адзначанай этнічнай групы ў палітычнай калабарацыі. Дадзенае татарскае насельніцтва, арыентаванае на супрацоўніцтва з новай уладай, групавалася ў асноўным вакол муфція Якуба Шынкевіча. Ён быў выбраны на гэтую пасаду ў 1925 г. на Усяпольскім мусульманскім з’ездзе ў Вільні. Муфціят у Вільні быў звязаны з татарскімі эмігранцкімі коламі ў Крыме. Брат муфція Якуба Шынкевіча Мустафа Шынкевіч (выхадзец з польска-беларуска-літоўскіх татараў, перад пачаткам І Сусветнай вайны пераехаў у Крым, у Бахчысарай) удзельнічаў у грамадска-палітычным руху ў Крыме ў 1917–1920 гг. У 1917 г. у Сімферопалі быў створаны Саюз татараў літоўскіх, які ён узначаліў. У 30-я гг. XX ст. Мустафа быў арыштаваны НКУС за антысавецкую дзейнасць і разам з сям’ёй высланы на поўнач (у Архангельск), дзе і памёр. Быў рэабілітаваны ў 1989 г. [2].

Сын Мустафы Шынкевіча, пляменнік муфція Якуба Шынкевіча – Эдыгей Шынкевіч нарадзіўся ў 1911 г., у Бахчысараі. Пачатковую і сярэднюю адукацыю атрымаў у мясцовай вясковай школе каля г. Ялта, затым працягнуў вучобу ў Ялцінскай гімназіі, паступіў у Сімферопальскі педагагічны інстытут. Каб не быць рэпрэсаваным савецкай уладай, ён уцёк з Крыма праз Каўказ у Іран (прабыў там каля паўгода), звярнуўся ў польскую амбасаду. У 1932 г. па дарозе ў Польшчу апынуўся ў Турцыі, дзе ўсталяваў блізкія кантакты з лідэрам палітычнай эміграцыі крымскіх татараў у Турцыі Джафарам Сейдаметавым (былым кіраўніком Курултая – татарскага нацыянальнага парламента ў 1917 –1918 гг. і прадстаўніком гэтай арганізацыі ў Лізе Нацый).

Пасля прыбыцця ў Польшчу ў 1935 г. Эдыгей Шынкевіч жыў у Вільні. Ажаніўся на Тамары Бяляк, татарке са Слоніма [3, с. 76]. Пачаў вучыцца ў Школе палітычных навук пры Інстытуце даследаванняў Еўропы Усходняй, якому, дарэчы, выдзяляліся фінансавыя сродкі

Усходнім аддзелам Міністэрства замежных спраў Польшчы і Экспазітурай № 2 ІІ Аддзела генеральнага штаба Польскай Арміі дзеля развіцця ідэй «праметэізму» [4, s. 81] – палітыкі Польскай дзяржавы, якая мела на мэце нейтралізаваць СССР як моцнага суседа шляхам насчлянення яго на асобныя дзяржаўныя ўтварэнні з нярускіх народаў пад пратэктаратам Польшы. Пастаўленую задачу Польская дзяржава здзяйсняла, супрацоўнічаючы з прадстаўнікамі палітычнай эміграцыі з Савецкай Расіі на Захадзе. Так, у 1926 г. у Парыжы была створана арганізацыя «Праметэўш», а ў 1926 г. у Варшаве – яе філіял клуб «Праметэўш», куды ўваходзілі прадстаўнікі ўкраінскай, грузінскай, азербайджанскай, туркменскай, паўночнакаўказскай эміграцыі, а таксама татары Крыма і Ідэль-Урала. Членам дадзенай арганізацыі быў і Эдыгей Шынкевіч. З 1936 г., асабліва ў 1937–1939 гг., галоўным цэнтрам прапаганды дадзенай ідэалогіі было Кола татарскай моладзі (КТМ) у Вільні. З 1937 г. – Цэнтральная рада гурткоў татарскай моладзі Польскай Рэспублікі, у склад якой уваходзіла сем чалавек [5, с. 19]. Гэтую арганізацыю ўзначальваў Эдыгей Шынкевіч. Функцыі яго намесніка выконваў Алі Смайкевіч. У адозвах КТМ, аўтарамі якіх былі яго вызначаныя лідары, ідзе размова аб Крыме і Ідэль-Урале як аб «краях блізкіх нашаму сэрцу» [6, с. 453]. Сваю дзейнасць Э. Шынкевіч накіроўваў на заснаванне блізкіх кантактаў з крымскімі татарамі і з крымскай палітычнай эміграцыяй у Турцыі.

Дарэчы, у мэтах палітыкі «праметэізму», якую здзяйсняла Польская Рэспубліка, дзяржаўным бюджэтам на 1939–1940 гг. было прадугледжана штомесячнае фінансаванне татарскіх нацыянальных колаў у Крыме, Ідэль-Урале і Туркестане, якія знаходзіліся ў эміграцыі (Турцыі, Францыі і Польшчы). Агульная сума фінансавання на адзначаны год, якая датычылася палітычнага кірунку дзейнасці, складала 9600 злотых у месяц [4, с. 85].

У 1938 г. у Э. Шынкевіча існаваў праект стварэння з эмігранцкай татарскай моладзі ў Польшчы і моладзі з ліку польскіх татараў арганізацыі «блакітных кашуль» (нацыянальны татарскі колер) накшталт «карычневых кашуль», якая б прытрымлівалася нацыянал-сацыялістычнай ідэалогіі. Аднак дадзены праект не быў рэалізаваны [6, с. 462].

У 1939 г. Э. Шынкевіч эвакуіраваўся разам з супрацоўнікамі турэцкага пасольства ў Турцыю, дзе прапагандаваў ідэю стварэння татарскай нацыянальнай дзяржавы ў Крыме [3, с. 76]. Узяў псеўданім Кырымал. У лістападзе 1941 г. прагерманскі накіраваны турэцкі генерал Хюсню Эмір Эркілет звярнуўся з лістом да амбасадара Германіі ў Турцыі Франца фон Папэна, у якім прасіў даць уязную візу ў Крым двум крымскататарскім палітычным дзеячам – Кырымалу Шынкевічу, які пражываў у Турцыі і Мюстэджыпу Улькусалю, які зходзіўся ў Румыніі. У сваім лісце ён адзначаў, што гэта вельмі надзейныя людзі, якіх можна выкарыстаць у агульных германа-турэцкіх інтарэсах.

У снежні 1941 г. абодва крымскататарскіх палітыка прыбылі ў Берлін, дзе паспрабавалі ўступіць у перамовы з нямецкімі ўладамі. У ходзе гэтых сустрэч яны выказалі пажаданні адносна лёсу Крыма, які павінен быў стаць саюзнай Германіі татарскай дзяржавай і прасілі дапусціць іх у лагера ваеннапалонных на тэрыторыі паўднёвай Украіны і Крыма, дзе ўтрымліваліся крымскія татары. Размовы пра незалежнасць Крыма немцы прынялі да ведама. У просьбе ж наведаць лагера яны адмовілі, спаслаўшыся на каранцін. Пазней, з дазволу А. Розенберга (міністра па справах акупаваных усходніх абласцей), у іх атрымалася пабываць у Польшчы, Літве і Беларусі, наведаць там рэгіёны, дзе кампактна пражывала мусульманскае насельніцтва. Яшчэ адным вынікам паездкі ў Берлін стала тое, што гэтым эмігрантам, хаця і неафіцыйна, удалося закласці асновы для будучага прадстаўніцтва крымскіх татараў у Германіі.

Такім чынам, з 1942 г. пляменнік муфція Я. Шынкевіча Эдыгей-Кырымал стаў прадстаўніком татарскіх інтарэсаў у Трэцім Рэйху [3, с. 76].

У гэтым жа г. ён прыбыў у Вільню як прадстаўнік Чырвонага Паўмесяца па справах савецкіх ваеннапалонных з ліку крымскіх татараў пры германскім штабе сухапутных войскаў. Ён меў заданне прапагандаваць сярод мясцовых татараў арганізацыю і дзейнасць татарскіх камітэтаў і самакіравання ў Крыме пад пратэктаратам Германіі. Аднак падтрымкі сярод мясцовых татараў ён не знайшоў [7, с. 147].

Увесь наступны год прайшоў у вырашэнні арганізацыйных пытанняў і ўмацаванні пазіцый крымскататарскага прадстаўніцтва ў Нямеччыне. За гэты час у ім адбыліся значныя змены. Улькусаль пакінуў Э. Шынкевіча і вярнуўся ў Румынію. Таму Кырымалу тэрмінова

прыйшлося шукаць сабе новага намесніка. Увесну 1942 г. ім стаў яшчэ адзін эмігрант – Абдула Сойсал. Акрамя таго, берлінскае прадстаўніцтва вырасла колькасна: цяпер у яго складзе было ўжо 12 чалавек. Сталі больш яснымі і бліжэйшыя палітычныя мэты, якія гэтая група ставіла перад сабой. Першачарговымі з іх прызнаваліся наступныя:

• палягчэнне долі крымскататарскіх ваеннапалонных і «ўсходніх працоўных», якія былі вывезены ў Германію;

• перасяленне ў Крым мусульманскага насельніцтва з Літвы, Беларусі і Румыніі з мэтай павялічыць колькасць татарскага насельніцтва на паўвостраве;

• наладжванне сувязі з татарскай грамадскасцю на тэрыторыі Крыма.

Ведаючы гэтыя мэты берлінскага прадстаўніцтва, немцы больш за год забаранялі яго членам наведваць паўвостраў. Першым, хто выступіў супраць, быў будучы генеральны камісар «Таўрыі» Альфрэд Фраўэнфельд. Па-першае, яго турбавалі палітычныя амбіцыі берлінскіх эмігрантаў. Па-другое, яму не падабаліся іх планы па перасяленню татарскага насельніцтва (сярод нацысцкага партыйнага кіраўніцтва Фраўэнфельд быў адным з найгалоўных адэптаў будучай германізацыі паўвострава). Тым не менш, у ліпені 1942 г. ён быў вымушаны паведаміць Кырымалу, што прызнае яго «штаб як паўнамоцнае прадстаўніцтва крымскіх татараў», але не больш чым у сферы эканамічных і гуманітарных інтарэсаў. Варта адзначыць, што на яго згоду паўплывала пазіцыя прафесара фон Мендзі, які ў міністэрстве А. Розенберга займаўся цюркскімі і каўказскімі народамі.

У лістападзе 1942 г. Кырымал і яго каманда атрымалі, нарэшце, дазвол прыехаць у Крым, дзе працавалі да канца года. Мэтай іх візіту была сустрэча з прадстаўнікамі мясцовай крымскататарскай грамадскасці. Таму ўжо 16 снежня пасля ўзгаднення гэтага пытання з начальнікам паліцыі бяспекі і СД берлінская дэлегацыя правяла сумеснае пасяджэнне з членамі Сімферопальскага мусульманскага камітэта. Кырымал і яго калега Абдул-Халіма Баліч інфармавалі актыў камітэта аб рабоце свайго прадстаўніцтва і паведамілі аб атрыманай дазволе на перасяленне ў Крым 25 тысяч татараў. Прычым 600 з іх, галоўным чынам сельскагаспадарчыя і тэхнічныя спецыялісты, былі ўжо наняты і гатовыя да пераезду. Кіраўніцтва камітэта выказала сваю поўную згоду дзейнасці берлінскага штаба, прызнала яго кіруючую ролю і абрала ў свой склад абодвух дакладчыкаў. Гэта пасяджэнне стала вялікім тактычным поспехам Кырымала і яго каманды. Цяпер з поўным правам яны маглі заявіць, што прадстаўляюць не толькі эмігрантаў, але і ўвесь крымскататарскі народ, чым не магло пахваліцца ні адно з нацыянальных прадстаўніцтваў. Міністэрства па справах акупаваных усходніх абласцей de jure пацвердзіла тое, што фактычна ўжо існавала. Штаб Кырымала быў прызнаны адзіным прадстаўніком інтарэсаў крымскататарскага народа і стаў афіцыйна называцца **крымскататарскім нацыянальным цэнтрам.** Гэта адбылося ў студзені 1943 г. А ўжо ў лістападзе таго ж года пры міністэрстве А. Розенберга быў створаны спецыяльны крымскататарскі аддзел, які і павінен быў даваць ўказанні Кырымалу і яго людзям.

Па трагічнай выпадковасці першым сумесным крокам кіраўніка аддзела доктара Конельсена і Кырымала стала іх спроба абраць крымскага муфція. Прыняць сан муфція Озенбашлы ўгаворваў менавіта Кырымал. Для гэтага ён спецыяльна наведаў Бухарэст, але так і не змог прымусіць старога нацыяналіста заняць пранямецкую пазіцыю. Яшчэ адным напрамкам работы Кырымала ў гэты перыяд з'яўляліся спробы выратаваць крымскататарскі актыў. У пачатку 1944 г. было ўжо зразумела, што рана ці позна Чырвоная армія вызваліць паўвостраў. Каб неяк падбадзёрыць мясцовых калабарацыяністаў, Кырымал паведаміў ім, што пасля сыходу Вермахта з Крыма ўсе татары будуць эвакуіраваны. Гэтую заяву ён ўзгадніў толькі з Конельсенам і не паставіў у вядомасць іншы зацікаўлены бок – штаб Камандуючага войскамі Вермахта ў Крыме. Рэакцыя на гэта паследавала неадкладна. Генерал-палкоўнік Эрвін Йенеке звярнуўся да свайго непасрэднага начальніка – камандуючага групы армій «А» – і прасіў яго давесці да ведама падначаленых А. Розенберга наступную інфармацыю: выключна па ўсіх пытаннях эвакуацыі з Крыма неабходна звяртацца толькі ў ваенныя інстанцыі. Не рабіць з гэтай выключна ваеннай акцыі палітычнага мерапрыемства [ 8 ].

У рэшце рэшт Кырымал усё ж здолеў дамовіцца аб эвакуацыі 60 актывістаў, 20 з якіх адразу ж папоўнілі шэрагі крымскататарскага аддзела міністэрства А. Розенберга. Яшчэ каля 2 тысяч (у асноўным байцы добраахвотніцкіх фарміраванняў) былі вывезены морам пасля пачатку баёў за паўвостраў [9 ].

Трэба адзначыць, што ні Вермахт, ні грамадзянская адміністрацыя ў асобе свайго прадстаўніка Фраўэнфельда не былі зацікаўлены ў стварэнні крымскататарскай дзяржаўнасці. Ды і паліцэйскія структуры, якія, па-сутнасці, былі ініцыятарамі стварэння мусульманскіх камітэтаў і ў сілу канкурэнцыі з двума папярэднімі галінамі ўлады павінны былі дзейнічаць ім насуперак, не імкнуліся легалізаваць палітычную дзейнасць крымскіх татар. Так, у адным са справаздач начальніка паліцыі бяспекі і СД «Таўрыі» (зіма 1942 г.) гаварылася наступнае: «Зыходзячы з агульнага вопыту, варта ўлічваць тое, што хутка можа ўзнікнуць неабходнасць звярнуць увагу на татарскі камітэт у Сімферопалі, які, магчыма, захоча выкарыстаць наяўнасць сумеснай барацьбы ў сваіх мэтах ... Іх цэнтралізатарскія памкненні выяўляюцца ў справах, якія адразу і не бачныя. Напрыклад, яны дамагаюцца атрымання пячаткі з надпісам «Мусульманскі камітэт для Крыма». Спробам такіх дамаганняў трэба надаваць вялікую ўвагу, не дапускаючы стварэння цэнтральнага кіраўніцтва і правядзення татарамі такой палітыкі» [10].

Да восені 1944 г. Кырымал застаўся адзіным больш ці менш аўтарытэтным крымскататарскім дзеячам, прызнаным Германіяй. Але фактычна ён ужо нікога не прадстаўляў: Крым зноў знаходзіўся пад савецкай уладай, а колькасць крымскататарскіх добраахвотнікаў у германскіх узброеных сілах і «ўсходніх працоўных» на тэрыторыі Рэйха вымяралася некалькімі тысячамі. Тым не менш, ключавым пунктам пазіцыі Кырымала ў гэты перыяд была поўная незалежнасць Крыма. Не раз абмяркоўвалася ў прэсе і ідэя так званага цюркскага адзінства. Па ёй, крымскія татары не толькі павінны былі атрымаць волю і незалежнасць, але яшчэ і адчуць сябе часткай «адзінага цюркскага свету». Таму ў супрацьлегласць нямецкай прэсе, якая называла крымскіх татараў «крымскімі татарамі», Кырымал і яго супрацоўнікі сталі ўжываць тэрмін «крымскія цюркі». З гэтымі ідэямі яны неаднаразова выступалі на старонках новай крымскататарскай газеты «Kirim» («Крым»), першы нумар якой выйшаў у Берліне 25 лістапада 1944 г. Такія панцюркісцкія ідэі былі далёка не новыя, хоць Кырымал і пісаў, што толькі цяпер ён і яго людзі маглі свабодна іх выказваць.

Нарэшце, 17 сакавіка 1945 г., ужо напярэдадні краху Германіі, А. Розенберг зрабіў ад імя ўрада Рэйха афіцыйную заяву, у якой Крымскататарскі нацыянальны цэнтр прызнаваўся «адзіным прадстаўніком (палітычным і дыпламатычным) крымскататарскага народа». Яго старшынёй па-ранейшаму заставаўся Кырымал, а вось склад цэнтра цалкам абнаўляўся: 12 яго членаў павінны былі прадстаўляць ўсе грамадскія пласты свайго народа. Абноўлены цэнтр пачаў сваю афіцыйную дзейнасць у красавіку 1945 г. Першым яго крокам была заява аб тым, што галоўнай палітычнай мэтай гэтай арганізацыі з'яўляецца барацьба за нацыянальнае і палітычнае вызваленне крымскіх татар. Але, як прызнае сам Кырымал, ва ўмовах ваеннага паражэння Германіі «перспектывы гэтай барацьбы былі вельмі сумніўныя» [10]. А само прызнанне аказалася звычайнай фікцыяй. Такі быў вынік палітычнага супрацоўніцтва крымскататарскіх нацыяналістаў з кіраўніцтвам Трэцяга рэйха.

Пасля заканчэння Другой сусветнай вайны Эдыгей жыў у Заходняй Германіі. Узначальваў крымскататарскую дыяспару ў Нямеччыне. Пасля дэпартацыі крымскіх татараў з Крыму Эдыгей- Кырымал пачаў актыўную барацьбу за правы свайго народа ў эміграцыі. Абараніў доктарскую дысертацыю ва ўніверсітэце горада Мюнстэр і атрымаў навуковую ступень доктара філасофіі. Яго галоўнай навуковай працай можна лічыць манаграфію «Нацыянальная барацьба крымскіх цюрак», якая была выдадзена на нямецкай мове ў 1952 г., у ёй аўтар выкарыстаў велізарную колькасць факталагічнага матэрыялу ў дачыненні да нацыянальнай барацьбы крымскіх татараў у 1917–1918 гг., дакументы з асабістага архіва, а таксама архіваў Джафара Сейдаметава, Мюстэджыпа Улькусаля, Абдулы Сойсала і іншых.

У 1954–1972 гг. Эдыгей-Кырымал Шынкевіч працаваў у Інстытуце па вывучэнні гісторыі і культуры СССР у Мюнхене, адначасова з'яўляючыся рэдактарам пэрыядычнага выдання на турэцкай мове «Dergi», які выдаваўся інстытутам. Ён працягнуў публікацыю сваіх навуковых артыкулаў аб крымскататарскім народзе ў часопісах Германіі і Турцыі на нямецкай, турэцкай мовах. Памёр Эдыгей- Кырымал у 1980 г., быў пахаваны ў горадзе Мюнхене.

У маі 2007 г. Э. Шынкевіч быў перапахаваны ў Крыме актывістамі меджліса (прадстаўнічы орган татараў), як «выбітны дзяржаўны дзеяч крымскататарскага народа». Аднак дадзенная акцыя была сустрэта крытыкай з боку шэрагу палітыкаў, у тым ліку дэпутатаў Вярхоўнай Рады Украіны, якія назвалі гэта мерапрыемства «прафашысцкай акцыяй». Такім чынам, стаўленне да асобы Эдыгея Шынкевіча, сапраўды, можа быць неадназначным у сувязі з яго супрацоўніцтвам з германскімі акупацыйнымі ўладамі ў гады Другой сусветнай вайны з мэтай рэалізацыі сваіх нацыяналістычных памкненняў.

## СПИСОК ЦИТИРОВАННЫХ ИСТОЧНИКОВ


1. Романько, О. В. Мусульманские легионы во Второй мировой войне / О. В. Романько. – М. : АСТ: Транзиткнига, 2004. – 321 с.
2. Открытый список. Шинкевич Мустафа Сулейманович – [Электронный ресурс] – Режим доступа : https://ru.openlist.wiki. –Дата доступа : 10.11.2018.
3. Podroze do serca islamu. Antologia miedzywojennego reportazu polskich tatarow // Colloquia orientalia bialostocensia. Studia tatarskie. / Pod redakcja G. Czerwinski. – Bialystok : katedra badan filologicznych "WSCHOD-ZACHOD". – Seria 3. – Bialystok, 2014. – 229 s.
4. Zbior dokumentow pplk. Edmunda Charaszkiewicza / Komitet Badan Naukowych; opracowanie A. Grywacz, M. Kwiecien, G. Mazur. – Krakow: Centrum dokumentacji czynu niepodleglosciowego, ksiegarnia Akademicka, 2000. – 185 s.
5. Chazbijewicz, S. Ideologie muzulmanow polskich w latach 1918–1939 / S. Chazbijewicz // Rocznik tatarow polskich. – 1993. – T. I. – S. 15–43.
6. Chazbijewicz, S. Ewolucja ideologii polskich muzulmanow w latach 1934–1939 / S. Chazbijewicz // Татары-мусульмане на землях Беларусі, Літвы і Польшчы : матэрыялы Першай міжнар. навук.-практ. канф., прысвеч. да 600-годдзя татарскага асадніцтва на землях Беларуска-Літоўскай дзяржавы, распачатага пры Вітаўце Вялікім, Мінск, 26–27 сак. 1993 г. : у 3 ч. / Беларус. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал.: І. Александровіч [і інш.]. – Мінск, 1995. – Ч. 3. – С. 449–467.
7. Tyszkiewicz, J. Z historii tatarow polskich 1794–1944 / J. Tyszkiewicz. – Pultusk, 1998. – 176 s.
8. Исаев, А. Битва за Крым / А. Исаев, Д. Хазанов, О. Романько, Н. Глухарев. – [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.litres.ru/ – Дата доступа: 05.11.2018.
9. Романько О. Крым в период немецкой оккупации. Национальные отношения, коллаборационизм, партизанское движение / О. Романько. – [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://krymtrek.ru/books/krym-v-period-nemeckoj-okkupacii-nacionalnye-otnosheniya-kollaboracionizm-i-partizanskoe-dvizhenie-1941-1944.html. – Дата доступа: 16.11.2018.
10. Романько, О.В. К истории крымскотатарского политического коллаборационизма в годы Второй мировой войны / О.В. Романько. – [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.evpatoriya-history.info/natsionalnij-vopros/tatari-i-kollaborasionizm.php. – Дата доступа: 16.11.2018.



***Gribova S.*** **Activity of Edygei Shinkevich as a representative of the nationalist Tatar communities of the Crimea on the eve and during the Second World War**

*This article is devoted to the activities of the leader of the nationalist communities of Crimea, Edygei Shinkevich, on the eve of and during the Second World War. The author notes the influence of the Polish policy of Prometheism in the interwar period on the formation of nationalist views among the Polish-Lithuanian Tatars. The author traces the connection of the muftiate in Vilna with representatives of the Crimea who aimed at using the occupation regime during the Second World War in their nationalistic aspirations, namely the creation of a Tatar national state in Crimea. The author provides detailed analysis of the actions of Edyge Shinkevich to implement the upper mentioned aim. It is noted that despite certain agreements with the German authorities in this direction, in fact German authorities were not interested in the implementation of the final goal of E.Shinkevich and his colleagues.*